# Прывітальная

Нашы песні вясёлы і звонкі
Прывітанне ад роднай старонкі
Многа шчасця, здароўя жадаем
І ў госці да нас запрашаем.

У нашых мясцінах мы дружна
жывём,
Любім, працуем і песні пяём
Рэкі, лясы і той казачны гай,
Родны свой кут успамінай

Вежа, рака, ставы каля млына,
Устрывожаны клёкам буслiным,
Песні, танцы і казкі бабулі
Толькі ў нас вы б такія пачулі.

Край наш любы, з азёраў сатканы,
Завітайце да нас у Варняны.
Хат вясковых гасціннасць
спазнайце,
І гаспадынь пірагоў паспытайце.

# УСТУП

**ВАРНЯНЫ** — вёска, цэнтр сельсавета. Вядома з 14 ст. У 1391 г. паселішча, уласнасць караля польскага і вялікага князя ВКЛ Ягайлы, з якога ён даў фундуш касцёлу ў Медніках. У 1397 г. з дазволу караля віленскі біскуп Андрэй запісаў дзесяціну віленскаму капітулу. У 1423 г. Варняны ўласнасць вялікага князя Вітаўта. У 1453 г. гаспадарская воласць ў Немежскім павеце, у якой кароль Казімір раздаваў землі сваім баярам і шляхце. Да 1462 г. Варняны ўласнасць Сангайлы, баярына караля Казіміра, дзе па яго тастаменту ў 1462 г. яго ўдава Марына заснавала парафіяльны касцёл і запісала яму ў фундуш дзесяціны з Варнян і іншых сваіх маёнткаў, землі і сялян. У 1502 г. ўласнасць Алены Андрэеўны Даўгірдаўны, удавы князя Петкі Свірскага. Пасля смерці Алены Даўгірдаўны маёнтак дастаўся яе сынам і дочкам, а пасля падзелу паміж імі матчыных і бацькоўскіх маёнткаў Варняны сталі ўласнасцю віленскага каноніка князя Андрэя Петкавіча Свірскага. Да 1511 г. маёнтак, уласнасць князя Андрэя Свірскага, які ён аддаў у заставу трокскаму ваяводзе, дворнаму маршалку Грыгорыю Станкавічу Осціку, мужу сваёй сястры князёўны Аляксандры Петкаўны Свірскай. Пасля смерці князя Андрэя Свірскага ў 1511 г. яго пляменнікі князі Пётр і Андрэй Міхайлавічы Свірскія аспрэчвалі маёнтак у Грыгорыя Осціка. Каля 1522 г. пасля смерці Г.С.Осціка маёнтак ва ўласнасці яго сыноў трокскіх ваяводзічаў Юрыя і Грыгорыя Грыгор’евічаў Осцікаў, які ў іх аспрэчваюць браты Пётр і Андрэй Свірскія. У 1524 г. маёнтак — уласнасць Альжбеты Грыгор’еўны Осцікаўны, жонкі Мікалая Станіслававіча Кежгайлы, якая скардзілася на братоў Юрыя і Грыгорыя Осцікаў, якія, аспрэчваючы ў яе маёнтак, наехалі на яго і спустошылі. Пасля 1532 г. маёнтак, які пасля смерці Альжбеты Осцікаўны яе браты Юрый і Грыгорый Осцікі трымалі ў супольным валоданні без падзелу маёнтка. У 1559 г. ўласнасць браслаўскага старасты Ю.Ю.Осціка, згадваюцца каталіцкая парафія і касцёл, у валоданні якога было 44 дымы падданых сялян. У 1580 г. Варняны перайшлі да караля, які падараваў маёнтак віленскаму войскаму Яну Абрамовічу. У 1593 г. Ян Абрамовіч запісаў фундушы існуючаму

тут парафіяльнаму касцёлу і заснаваў пры ім школу для шляхецкіх дзяцей.

У ваколіцах маёнтка і мястэчка Варняны, якія належалі Осцікам, у 16 ст. знаходзілася мноства маёнткаў і фальваркаў дробнамаянтковай шляхты і баярства, якія насілі тую ж назву — Варняны. Уладальнікамі маёнткаў былі гаспадарскі баярын М.А.Гібутовіч, князь Г.Ю.Пронскі, гаспадарскі дваранін А.Г.Дзежа, каралеўскі ротмістр І.Мікуліч, віленскі зямянін В.Стаброўскі, віленскі падсудак С.Косінскі, віленскі зямянін Ш.А.Забэла, падляшскі ваявода М.П.Кішка-Цеханавецкі і інш.

З 1795 г. Варняны ў Расійскай імперыі, у Віленскім павеце Віленскай губерні; у 19 ст. мястэчка, цэнтр воласці. У 1860 г. прыватнае ўладанне генерал-лейтэнанта Абрамовіча. На беразе ракі Газянка размяшчаўся маёнтак, у склад якога ўваходзілі 8 населеных пунктаў. Забудова маёнтка складалася з жылога дома і гаспадарчых пабудоў (амбары, кухня, лядоўня і інш.). У маёнтку працавалі цагельня, млын, бровар. У 1861 г. ў мястэчку працавала народнае вучылішча і фельчарскі пункт. У 1880 г. мястэчка, 24 двары, 249 жыхароў, былое прыватнае ўладанне, касцёл, яўрэйскі малітоўны дом, прытулак, 18 лавак, заезны дом, карчма, цагельня. Праходзілі штотыднёвыя таргі. На працягу года адбываліся 12 кірмашоў. У 1897 г. цэнтр Варнянскай воласці Віленскага павета Віленскай губерні, 32 двары, 384 жыхары, касцёл, яўрэйскі малітоўны дом, народнае вучылішча, сталовая кватэра, паштовая станцыя, 14 лавак, заезны дом з карчмой, вінны склад, 9 кірмашоў на год. У народным вучылішчы ў 1901 г. вучыліся 69 хлопчыкаў. У 1905 г. 317 жыхароў. У маёнтку, які знаходзіўся побач — 75 жыхароў. Маёнтак належаў памешчыцы Асцімскай, якая мела тут 2730 дзесяцін зямлі. У гады 1-й сусветнай вайны мястэчка акупіравана германскімі, у 1919—1920 гг. — польскімі войскамі. З 1922 г. ў складзе Польшчы, цэнтр Варнянскай гміны Віленска-Трокскага павета Віленскага ваяводства. У 1938 г. 37 двароў, 324 жыхары. З 1939 г. ў складзе БССР. З 12.10.1940 г. вёска, цэнтр Варнянскага сельсавета Астравецкага раёна Маладзечанскай вобласці. У час Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941 г. да ліпеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У баях за вызваленне вёскі загінулі 27 воінаў і партызан. З 20.1.1960 г. ў Гродзенскай вобласці, з 25.12.1962 г. ў

Ашмянскім, з 6.1.1965 г. зноў у Астравецкім раёнах. У 1970 г. 341 двор, 1284 жыхары. На 1.1.2004 г. 448 двароў, 1288 жыхароў, цэнтр СВК «Варняны». Дом культуры, аддзяленне сувязі, сярэдняя школа, бібліятэка, 7 магазінаў, аптэка, комплексны прыёмны пункт, дзіцячы сад. Помнікі: архітэктурны ансамбль (2-я палавіна 18 — 1-я палавіна 19 ст.); плябанія і дом аптэкара (1770); касцёл св. Георгія (1767-69); палацава-паркавы комплекс (сфарміраваны ў 1-й палавіне 19 ст., не захаваўся); вайсковыя могілкі (пахаваны польскія і нямецкія салдаты, якія загінулі ў 1-ю сусветную вайну); помнікі: В.І.Чапаеву; на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, што загінулі ў 1944 г.

**Памяць:** Гіст. – дакум. хроніка Астравецкага раёна. – Мн.: БелЭн,2004. -632с.

# АДКУЛЬ У ВЁСКІ ІМЯ

Мяркуецца, што слова «Варняны» паходзіць ад літоўскага слова і азначае «шпакоўня»

# ВІЗІТКА ВЁСКІ

231220
в. Варняны
Астравецкі раён
Гродзенская вобласць
Рэспубліка Беларусь

ВАРНЯНЫ, вёска ў Беларусі, у Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 14 км ад г.п. Астравец, 216 км ад Гродна, 19 км ад чыг. ст. Гудагай, на шашы, што звязвае Варняны з Астраўцом.

З 1688г. — мястэчка. З 1795 у складзе Расійскай імперыі. У 1921—39гг. у складзе Полыпчы, у Ашмянскім павеце Віленскага ваяводства. З 1939 у складзе БССР, з 1940 цэнтр сельсавета Астравецкага раёна. У 1962— 65гг. знаходзіцца ў Ашмянскім раёне. У 1970годзе налічвалася 1284 жыхары.

Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, камбінат бытавога абслугоўвання, аддзялення сувязі. *Варнянскі архітэктурны ансамбль.*

# ТЫПОВЫЯ ДЛЯ ВЁСКІ ПРОЗВІШЧЫ

Чапукойць, Гражуль, Александровіч, Масейка, Юркойць, Блашкевіч, Лукша, Багдановіч.

# ЧАС УТВАРЭННЯ ВЁСКІ

Частка вялікакняжацкіх зямель Меміжскага двара мела назву Варняны з аднайменным паселішчам у цэнтры.

Упершыню Варняны згадваюцца ў гэтай якасці ў 1391 г., калі кароль Ягайла ахвяраваў землі новапабудаванаму касцёлу ў Медніках (цяпер у Літве) і падпарадкаваў яго касцёлу ў Быстрыцы. У дакуменце 1397 г. Варняны непасрэдна называліся вёскай караля Ягайлы, з якой па яго дазволу віленскі біскуп ксёндз Андрэй прызначыў дзесяціну Віленскай капітуле. У Літоўскай метрыцы (архіве вялікакняжацкай канцылярыі ў захаваліся два кароткія запісы — адзін 1453 г., а другі недатаваны, якімі кароль Казімір надаў землі ў Варнянах сваім падданым. У першым запісе гаворыцца пра зямлю «Гейдюшкі ў Ворнянех» з чалавекам «Нарюцем», падараванай Ганцю Ашменцю Бертулевічу, а ў другім — аб узнагароджанні каралём Чыжа, Німірава брата якому (у Ворнянех Мемижской волости» былі нададзены 6 чалавек. Верагодна, апошняе дараванне паклала пачатак маёнткам Варона, Чыжэўшчына і інш. у наваколлі Варнян, якімі валодалі розныя прадстаўнікі роду Чыжоў аж да 20 ст.

З прыведзеных вышэй дакументаў відаць, што Варняны і навакольная воласць у канцы 14 — першай палове 15 ст. належалі вялікім князям літоўскім. Тут яны раздавалі землі сваім васалам і каталіцкім касцёлам. Аднак, ужо ў 1462 г. ўладальніцай Варнян па смерці свайго мужа Сангайлы (Сунігайлы) называецца Марына, якая паводле тастамента нябожчыка, заснавала тут парафіяльны касцёл у імя Божага Цела з прыдзельнымі алтарамі Дабравешчання Дзевы Марыі, святых Пятра Апостала і Марыны і запісала яму ў фундуш даніны з Варнян і іншых сваіх маёнткаў. Тут можна выказаць меркаванне, што кароль Казімір недзе ў сярэдзіне 15 ст. за нейкія заслугі надаў ужо састарэламу Сангайлу (ён згадваецца ў дакументах ужо ў канцы 14 ст., а на Гарадзельскім сойме 1413 г.

кароль Ягайла яму, аднаму з першых 28 беларуска-літоўскіх баяраў, прызнаў шляхецкі тытул па польскаму ўзору і рыцарскі герб) частку зямель у Варнянскай воласці разам з паселішчам Варняны, цэнтрам воласці, дзе ўжо пасля яго смерці ўдава Марына пабудавала і фундавала касцёл. Справа ў тым, што ўжо з 2-й палавіны 15 ст. Варняны фігуруюць як прыватнае ўладанне, аб чым будзе сказана далей. А гаспадарскія землі Меміжскай воласці ў гэтым рэгіёне пазней былі выдзелены ў асобную воласць, вядомую з 2-й палавіны 16 ст. пад назвай Высакадворскай.

Ад першай згадкі ў дакументах у 1391 г. Варняны былі ўладаннем вялікіх князёў літоўскіх і з'яўляліся цэнтрам адміністрацыйнай акругі ў Меміжскай воласці (павеце), дзе гаспадары раздавалі землі васалам і касцёлам. Магчыма, у сярэдзіне 15 ст. вялікі князь надаў паселішча Варняны з некаторымі землямі свайму баярыну Сангайле (Сунігайле), а калі той памёр, удава Марына, паводле яго тастамента 1462 г., заснавала ў Варнянах парафіяльны касцёл Божага Цела і запісала яму зямельныя, грашовыя і іншыя фундушы. Пасля смерці бяздзетнай Марыны маёнтак як вымарачны, відаць, адышоў ва ўласнасць караля Казіміра. Вядома, што кароль пажалаваў маёнткі Лынтупы, Свіраны і Трокенікі (ці пацвердзіў валоданне імі) дочкам былога іх уладальніка нябожчыка Андрэя Даўгірдавіча Ганне Даўгірдаўне, жонцы Юшкі Гайцэвіча, і Алене Даўгірдаўне, жонцы князя Петкі Свірскага. Можна меркаваць, што аналагічны запіс Казімір зрабіў і наконт Варнян. Справа ў тым, што ў тым жа фундацыйным дакуменце 1462 г. фігуруе сангалаўскі маёнтак Трокенікі, але пад гэтай назвай магло быць і некалькі маёнткаў (як Свіраны, якія ў той перыяд належалі Даўгірдавічу і Сангайле). Слушным з'яўляецца меркаванне польскага гісторыка У.Самковіча аб сваяцтве родаў Сангайлаў і князёў Свірскіх, якія мелі маёнткі ў тым жа рэгіёне. Верагодней за ўсё, кароль Казімір надаў Варняны прадстаўніку рода Свірскіх як сваяку і нашчадку памерлага Сангайлы, а менавіта князю Петку Свірскаму, мужу Алены Даўгірдаўны; якая пасля яго смерці валодала яго маёнкамі. Памерла Алена Даўгірдаўна ў 1502 ці 1503 г., запісаўшы тастаментам усе маёнткі сваім 3 сынам і 6 дочкам. У 1503 г. ўзніклі спрэчкі паміж братамі і сёстрамі, і кароль Аляксандр рашыў падзяліць маёнткі паміж імі пароўну.

Дзельчы ліст паміж братамі і сёстрамі Свірскімі не захаваўся, але вядома з іншых дакументаў, што Варнянамі валодаў віленскі канонік князь Андрэй Петкавіч Свірскі, які быў таксама пробашчам Варнянскага касцёла. Ён павялічваў памеры маёнтка, скупаючы землі ў навакольных баяр і зямлян, што відаць з яго фундацыйнага дакумента 1508 г. варнянскаму касцёлу. Маючы патрэбу ў грашах, князь Андрэй Свірскі аддаў Варняны ў заставу за 230 коп грошаў трокскага ваяводзе і дворнаму маршалку Грыгорыю Станкевічу (Станіслававічу) Осціку, мужу сваёй сястры Аляксандры Свірскай. Пасля смерці Свірскага ў 1511 г. Осцік працягваў трымаць маёнтак, бо нябожчык паспеў вярнуць толькі 100 коп грошаў. Тады ж, у 1511 г., пляменнікі нябожчыка князі Пётр і Андрэй Міхайлавічы Свірскія звярнуліся ў суд з прэтэнзіямі да Грыгорыя Осціка аб праве валодання маёнткам. Суд пастанавіў, каб Свірскія вярнулі Осціку рэшту доўгу свайго дзядзькі, а затым падзялілі маёнтак паміж сабой і цёткай Аляксандрай Свірскай.

Фактычнай уладальніцай Варнян з'яўлялася княгіня Аляксандра Свірская як спадчынніца нябожчыка Андрэя Свірскага, свайго брата. Калі яна памерла, маёнтак трымаў яе муж Грыгорый Осцік, а пасля яго смерці ў 1518 г. і смерці яго старэйшага сына Станіслава Осціка ў 1519 г. ўсе ўладанні перайшлі да малодшых дзяцей. Відаць, Юрый і Грыгорый Грыгор'евічы Осцікі былі яшчэ непаўналетнімі, таму Варняны трымала іх старэйшая сястра Альжбета, жонка Мікалая Станіслававіча Кежгайлы. Паміж братамі і сястрой былі пэўныя рознагалоссі наконт уладання маёнткамі, бо ў 1524 г. Альжбета скардзілася ў суд, што браты наехалі на маёнтак Варняны і спустошылі яго, дамагаючыся падзелу. Аднак, суд рашыў, каб перад падзелам маёнтка Осцікі спачатку кампенсавалі страты сястры. З далейшых дакументаў відаць, што Варняны, а таксама Свіраны яшчэ ў 1532 г. знаходзіліся ва ўладанні Альжбеты Осцікаўны. Толькі пасля яе смерці браты Осцікі змаглі завалодаць маёнткамі, якія трымалі разам, непадзельна. Сваю палову маёнткаў Грыгорый Грыгор'евіч Осцік аддаў у заставу за 500 коп грошаў брату Юрыю Осціку, які ў 1546 г. тастаментам запісаў гэтыя грошы сваім малодшым непаўналетнім сынам Юрыю і Грыгорыю, а сваю ўласную палову маёнткаў завяшчаў як малодшым сынам, так і старэйшаму Мікалаю. Вызваліўшыся з-пад апекі нябожчыка дзядзькі, а таксама

маці, княгіні Марыны Міхайлаўны Мсціслаўскай, абодва браты заключылі згоду, адпаведна з якой Свіраны дасталіся Грыгорыю, а Варняны — Юрыю. Юрый Осцік павялічваў свой маёнтак, прыкупляючы фальваркі і землі ў навакольнай шляхты. Трэба адзначыць, што вакол буйнога магнацкага маёнтка Осцікаў Варняны цераспалосна з яго землямі размяшчалася мноства дробных маёнткаў і фальваркаў павятовай шляхты, якія ў 16 ст. насілі тую ж самую назву — «Ворняны», «Ворнены», «Орняны». Пазней адны з іх атрымалі іншыя назвы, а другія зліліся з суседнімі маёнткамі ў працэсе купляў-продажаў, дарэнняў і да т.п. У 1567 г. мсціслаўскі ваявода і браслаўскі староста Ю.Ю.Осцік выставіў у войска ВКЛ са сваіх 17 маёнткаў, у тым ліку і з Варнян, 61 коннага воіна і 35 драбоў, акрамя таго ён дадаў «на ласку короля» яшчэ 80 копнікаў, а ўсяго — 141 вершніка. Памёр Юрый Осцік у 1579 г., не пакінуўшы нашчадкаў. Усе свае маёнткі ён запісаў тастаментам сваёй другой жонцы Магдалене Брамоўскай з Ломніц. Брат нябожчыка Грыгорый Юр'евіч Осцік, як найбліжэйшы сваяк, прэтэндуючы на братавы ўладанні, пачаў судовыя разборы з удавой абануляванні тастамента. Прайграўшы працэсы, ён абвінаваціў удаву ў атручэнні мужа.

У выніку Брамоўская ўступіла і пераказала Грыгорыю Осціку маёнткі мужа, у тым ліку і Варняны Неўзабаве кароль Стафан Баторый частку гэтых маёнткаў, а менавіта Варняны і Свіраны, пажалаваў за ваенныя заслугі віленскаму войскаму Яну Абрамовічу. З тых часоў прадстаўнікі роду падпісалі дакументы: «Абрамовічы на Варнянах». Ян Абрамовіч, стаўшы калятарам Варнянскага касцёла, абдараваў храм фундушамі, заснаваў пры ім школу для шляхецкіх дзяцей і шпіталь для састарэлых і інвалідаў. З'яўляючыся кальвіністам, ён мог прычыніцца да фундацыі кальвінскага збору ў Варнянах (Вароне) Чыжоў, але ў сваім маёнтку каталіцкі касцёл у кальвінскі храм не перарабляў. Пасля смерці Яна Абрамовіча Варнянамі завалодаў яго сын Мікалай Абрамовіч, які, будучы мсціслаўскім кашталянтам (з 1640 г.), павялічыў фундуш варнянскай плябаніі і касцёла. Пасля яго смерці ў 1651 г.. маёнтак апынуўся ў руках яго адзінага сына Самуэля Абрамовіча, старадубаўскага старосты, які вярнуўшыся ў каталіцтва, у 1654 г. атрымаў ад віленскага біскупа прывілей на аднаўленне і ўпрыгожанне касцёлаў у сваіх маёнтках Варняны і Кабыльнік.

Пазней Варнянамі валодаў старэйшы сын Самуэля губскі староста Самуэль Міхал Абрамовіч, які жыў яшчэ ў 1679 г. Відаць, ён памёр, не маючы дзяцей, таму што маёнткам потым валодаў яго брат Андрэй Абрамовіч, віленскі скарбнік. Апошні запісаў Варняны свайму малодшаму сыну Самуэлю Абрамовічу, віленскаму стольніку, які жыў у 1-й палавіне 18 ст. Калі ён памёр, недзе пасля 1745 г. ўладальнікам маёнтка стаў яго сын Андрэй Абрамовіч, віленскі земскі пісар (з 1761 г. брэсцкі кашталян). Андрэй задумаў пабудаваць у Варнянах мураваны касцёл замест старога драўлянага, аднак неўзабаве, у 1763 г., памёр, не здзейсніўшы задумы. Па праву спадчынніка маёнтак атрымаў брат нябожчыка старадубаўскі і губскі староста Юрый Абрамовіч, які, паспеўшы ўзвесці толькі мураваныя сцены новага касцёла, памёр у 1766 г., запісаўшы маёнтак у пажыццёвае валоданне сваёй жонцы Марцыяне з Дэрналовічаў. Марцыяна, заснаваўшы ў 1767 г. дамініканскую місію пры адбудаваным з большага Варнянскім касцёле, запрасіла манаха-дамініканца з астравецкага кляштара і запісала яму грашовы фундуш. У 1769 г. яна скончыла будаўніцтва і ўпрыгожанне касцёла, які быў асвячоны 28 кастрычніка віленскім суфраганам ксяндзом Зяновічам. Пазней Варняны былі ў сумесным валоданні Марцыяны і яе паўналетніх сыноў Андрэя і Яхіма Абрамовічаў. Пасля смерш маці браты ў 1787 г. падзялілі паміж сабой; бацькоўскія і матчыны маёнткі, у выніку чаго ўладальнікам Варнян стаў Яхім Абрамовіч.

## ТАКОЙ БЫЛА ВЁСКА

Вельмі вялікія бядоты і няшчасці як уладальнікам маёнткаў, так і іх падданым прыносілі войны. Асабліва спусташальнымі былі вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654 — 67 гг. і Паўночная вайна 1700 — 21 гг. Баявыя дзеянні і акупацыя рускімі войскамі значнай часткі княства ў 1655 — 61 гг. мелі непасрэднае дачыненне і да тэрыторыі Астравеччыны. Астравец, Міхалішкі, Варняны і іншыя паселішчы былі на шляху варожых войск Маскоўскай дзяржавы, якія імкнуліся захапіць сталіцу Вялікага княства Літоўскага Вільню, куды яны ўвайшлі 8.8.1655 г. Акупанты знявольвалі шляхціцаў, якія не прынеслі прысягу рускаму цару, рабавалі і палілі іх маёнткі і

вёскі. У час баявых дзеянняў і сутычак паміж супрацьстаячымі бакамі ў першую чаргу цярпела насельніцтва вёсак і мястэчак — сяляне і мяшчане. Простыя людзі гінулі ў час вайсковых сутычак, нападаў марадзёраў, шмат жыхароў памерла ад эпідэмій і голаду ў неўраджайныя 1657, 1958 гг. Значная частка людзей падверглася гвалтоўнаму выгнанню ў Маскоўшчыну рускімі войскамі. Жыхары, якія засталіся жывымі, уцякалі са сваіх наседжаных месцаў, ратуючыся ад голаду і праследаванняў.

## У складзе Расійскай імперыі

Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) Вялікае княства Літоўскае назаўсёды знікла з палітычнай карты Еўропы. Астравеччына як адна з састаўных яго частак аказалася падзеленай паміж Віленскім, Ашмянскім, Завілейскім (Свянцянскім) паветамі Літоўскай губерні з цэнтрам у Вільні. Межы паветаў на абшарах сучаснай Астравеччыны праходзілі па рэках Лоша, Ашмянец, Вілія.

Пасля адмены прыгоннага права 19.2.1861 г. зямля па-ранейшаму заставалася ў буйных магнатаў. За скупыя надзелы, вызначаныя сялянскай рэформай 1861 г., сяляне павінны былі плаціць велізарны выкуп. У адказ на гэта амаль па ўсёй краіне пракаціліся сялянскія хваляванні. Жыхары многіх беларускіх вёсак часта адмаўляліся выконваць феадальная павіннасці, у тым ліку хадзіць на паншчыну або плаціць аброк.

Сяляне адмовіліся ад «маніхвестаў» і заявілі, што больш не будуць адбываць ніякай паншчыны. Як паведамляў 24 сакавіка віленскаму генерал-губернатару У.І.Назімаву грамадзянскі губернатар Пахвіснеў, на месца здарэння быў накіраваны земскі спраўнік, які спрабаваў пераканаць сялян у неабходнасці «паслушэнства». Але словы спраўніка не падзейнічалі на сялян: яны па-ранейшаму адмаўляліся хадзіць на паншчыну. Больш таго, з Міхалішак і Чэхаў хваляванні перакінуліся ў іншыя вёскі — Варняны, Дубнікі, Гервяты і далей на поўдзень — у Шумск, Меднікі, Каменны Лог.

Сіламі царскіх штыкоў, нагайкамі і розгамі быў устаноўлены «парадак» у Варнянах (належалі генералу Адамовічу) і Дубніках. Многіх варнянскіх прыгонных сялян каралі розгамі, галоўнага ж “падбухторшчыка” дзесяцкага Фадзея Палевіча арыштавалі.

Развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы і прамысловасці паглыбляла грамадскі падзел працы, расклад непасрэдных вытворцаў на капіталістаў і рабочых. Усё гэта паслужыла асновай для складвання і развіцця ўнутранага рынку, чаму таксама садзейнічаў хуткі рост шляхоў зносін, асабліва чыгуначнага транспарту. Праз тэрыторыю Астравеччыны праходзіла ажыўленая шаша “Вільня — Полацк”. Па тэрыторыі раёна працякала рака Вілія.

Усё гэта вызначыла значэнне мястэчак Астравец, Варняны, Міхалішкі. У канцы 19 ст. ў мястэчку Варняны кожны тыдзень праходзілі базары, а ў дні касцельных фэстаў — кірмашы. Па меры развіцця капіталістычных адносін кірмашовы гандаль выцясняўся магазінным і лавачным. У Варнянах працавала 18 магазінаў і лавак. Жыхары мястэчак атрымлвалі газеты «Віленскі веснік», «Биржевые новости», пазней і «Віленскія губернскія ведамасці».

19.2.1861 г. Аляксандр II падпісаў Маніфест і зацвердзіў праект «Палажэнняў» аб адмене прыгону ў Расійскай імперыі. У Беларусі маніфест быў абнародаваны ва ўсіх губернскіх гарадах з 8 па 12 сакавіка, у сельскай мясцовасці — у красавіку — маі. Скарачэнне памераў надзелаў, абеззямельванне сялянства пры ўвядзенні «Палажэнняў», наогул грабежніцкі характар рэформы (сялян прымусілі выкупляць надзелы, якія знаходзіліся ў іх карыстанні, і выкуп перавышаў сапраўдную яго цану) паслужыў штуршком да новага этапу сялянскага руху, бо рэформа не адпавядала інтарэсам сялян, якія змагаліся за поўнае знішчэнне прыгонніцтва.

Сялянскія хваляванні пачаліся літаральна паўсюдна праз некалькі дзён пасля аб'яўлення Маніфеста і працягваліся амаль да чэрвеня — ліпеня 1861 г. Імі былі ахоплены многія паветы Віленскай, Ковенскай, Мінскай, Гродзенскай і іншых губерняў. Абурэнне сялян выклікала і тое, што практычнае ажыццяўленне рэформы адкладвалася на 2 гады. Незадаволенасць прывяла да чутак аб «фальшывасці» Маніфеста і «Палажэнняў».

Масавыя хваляванні сялян ахапілі ўсе паветы Віленскай губерні. Асабліва востры характар прыняла барацьба сялян у маёнтку памешчыка Котвіча Віленскага павета. 15 сакавіка, атрымаўшы ад станавога прыстава 2 экзэмпляры «Палажэнняў» аб сялянах, якія

выйшлі з-пад прыгонніцтва, памешчык хацеў адзін экзэмпляр перадаць прыгонным сялянам сваіх маёнткаў Міхалішкі, Турлы, Лабудзі, Чэхі, але яны гэтага не прынялі і аб'явілі, што не будуць адбываць ніякай паншчыны. Пазней сяляне прынялі «Палажэнне», аднак, нягледзячы на довады прыстава і тутэйшага ксяндза, выконваць паншчыну па-ра-нейшаму адмовіліся. У маёнтак быў накірава-ны земскі спраўнік П.Грыгор'еў для растлумачэння сялянам абавязкаў, «навучання іх і ўнушэння ім адпаведнай дваровай і памешчыцкай уладам паслухмянасці», але ўсе доказы спраўніка на сялян не дзейнічалі. Сваім прыкладам — не выконваць паншчыну — сяляне захапілі і прыгонных суседніх маёнткаў памешчыкаў Мінайкі і Абрамовіча.

Земскі спраўнік Грыгор'еў 24.3.1861 г. дакладваў губернатару Пахвісневу, што хваляванні сялян распаўсюдзіліся на наступныя маёнткі Віленскага павета: Варняны памешчыка Абрамовіча, Дубнікі —Мінайкі, Гервяты —Дамейкі, Шумск—Ляковіча, Меднікі — Сідаровіча, Каменны Лог—Грынявіцкага і іншыя, дзе сяляне адмовіліся ад паншчыны і паўсталі супраць памешчыкаў, аб'явіўшы ім, што ўсе адносіны з імі яны спыняюць. Сялянскія хваляванні ў сакавіку — красавіку 1861 г. мелі месца таксама ў маёнтках Рымдзюны, Гудзянікі, Язава.

Для падаўлення сялянскіх хваляванняў у маёнтках Міхалішкі, Варняны, Гервяты, Турлы і інш., паводле распараджэння Віленскага генерал-губернатара Назімава, з Вільні накіравана 12-я рота Лібаўскага пяхотнага палка на чале з жандарскім штаб-афіцэрам падпал-коўнікам Адамовічам разам з надворным саветнікам Грыгор'евым.

## УСТАНАЎЛЕННЕ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

25.10 (7.10.1917 г.) ў сталіцы Расіі Петградзе перахмагло ўзброенае паўстанне, падрыхтаванае партыяй балышавікоў, якая абвясціла курс на сацыялістычнае пераўтварэне грамадства (сацыялістычную рэвалюцыю). Рэха гэтых падзей, у якіх разам з іншымі беларусамі прынялі ўдзел многія ўраджэнцы Астравеччыны, хутка дакацілася да Беларусі. Да зімы 1917 г. савецкая ўлада перамагла паўсюдна ў цэнтральнай і ўсходняй

частках Беларусі. Астравеччына (на той час асобнымі часткамі ўваходзіла ў склад Віленскага, Ашмянскага і Свянцянскага паветаў Віленскай губерні) была сярод тых заходніх мясцовасцей Беларусі, якія з восені 1915г. знаходзіліся пад германскай акупацыяй.

Рэвалюцыйныя падзеі развіваліся імкліва. Да сярэдзіны лютага 1919 г. Чырвоная Армія ачысціла ад германскіх войск амаль усю тэрыторыю Беларусі, у тым ліку і Астравеччыну, а таксама большую частку Літвы. На вызваленай тэрыторыі ўсталёўвалася савецкая ўлада, органамі якой да выбрання Саветаў станавіліся рэвалюцыйныя камітэты (рэўкомы). Першыя рэўкомы на тэрыторыі сучаснага Астравецкага раёна ўтварыліся ў Астраўцы, Міхалішках, Варнянах з прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва. 28.1.1919 г, ў валасным цэнтры мястэчку Быстрыца на сходзе жыхароў воласці

Аднак савецкая ўлада ў краі пратрымалася нядоўга. У красавіку —маі 1919 г. войскі Польшчы захапілі Вільню і прылеглыя беларускія землі, сярод якіх была і Астравеччына.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі сталі ўзнікаць падпольныя бальшавісцкія арганізацыі для таго, каб аб’яднаць народы Беларусі. У 1921г. такія арганізацыі існавалі ў Нова-Вілейцы, Лідзе, Ашмянах. Адным з актыўных членаў КПЗБ (Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі) на Астравеччыне быў ураджэнец в. Бабраўнікі Іван Адамавіч Лукша, удзельнік рэвалюцыйных кастрычніцкіх падзей 1917г. у Маскве. З’яўляючыся сакратаром Пабрадскага падпольнага райкома партыі, ён арганізаваў у в. Барані (Падольскі с/С) адну з першых камуністычных ячэек. Некалькі пазней ячэйкі з’яўляюцца ў Міхалішках былі створаны падрайком КПЗБ (сакратар І.Гражуль, члены Р.Мацыеўскі, І.Бяляўскі, Ф.Бублевіч). У той жа час быў арганізаваны і Варнянскі падрайком КПЗБ. Ён складаўся з трох членаў — Ю.Сячынскага, К.Узарэвіча, А.Мажэйкі.

17 верасня 1939г. Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую граніцу і пачала займаць заходнія вобласці Беларусі і Украіны у т.л. і Астравеччыну. Адразу ж, паводле загаду камандуючага войскамі Беларускага фронту камандарма 2-га рангу М.П. Кавалёва, тут пачалі стварацца часовыя органы кіравання — валасныя і вясковыя сялянскія камітэты, у склад якіх уваходзілі прадстаўнікі працоўных, Чырвонай Арміі. У Астраўцы, Варнянах, Міхалішках, Гервятах і

іншых населеных пунктах адбываліся мясцовыя сходы. Іх удзельнікі выбіралі сялянскія камітэты, якім перадавалася часовая ўлада.

Агульнае кіраўніцтва сялянскімі камітэтамі, створанымі таксама ў Варнянах, Гервятах, Астраўцы і іншых месцах раёна, ажыцяўляў Варнянскі валасны камітэт. Першым яго старшынёй быў К.М.Валуевіч. Камітэты падтрымлівалі грамадскі парадак, наладжвалі палітычнае, гаспадарчае, культурнае жыццё ў краі.

Між тым, дажываў свае апошнія дні стары адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Яшчэ ў канцы верасня 1939 г. са складу Віленска-Трокскага павета, які адыходзіў да Літвы, у склад Ашмянскага павета былі перададзены Варнянская і Гервяцкая гміны. 4.12.1939 г. Ашмянскі, Свянцянскі (у яго складзе паўночная частка сучаснай Астравеччыны) і іншыя паветы ўвайшлі ў склад новаўтворанай Вілейскай вобласці БССР. У студзені 1940 г. Ашмянскі павет, які праіснаваў амаль 4 стагоддзі, быў скасаваны. З паўночнай часткі яго былой тэрыторыі 15.1.1940 г.быў утвораны Астравецкі раён. Вось як успамінаў тыя часы Рыгор Рыгоравіч Панамароў, тагачасны 1-ы сакратар райкома партыі, потым, пасля вайны, міністр нарыхтовак сельгаспрадуктаў БССР, персанальны пенсіянер: «Па даручэнні ЦК Камуністычнай партыі нашай рэспублікі яшчэ з двума таварышамі я выехаў у былы Ашмянскі павет, які меркавалася падзяліць на тры раёны. У Ашмянах прыблізна, па карце, вызначалі граніцы. К вечару, памятаю, дабраўся да станцыі Гудагай. Там тады была мытня — непадалёку праходзіла граніца з Літвой, тады буржуазнай. Пераначаваў з нашымі мытнікамі, а назаўтра ўзяў курс на Астравец. Гляджу — звычайная драўляная вёсачка. Няма дзе размясціць раённыя ўстановы, няма дзе нават жыць. Тады рашыў паездзіць па раёну. У Малях, дзе як раз кватараваў кавалерыйскі эскадрон, знайшоў транспарт. Заглядваю ў адну вёску, другую. Найбольш прыйшлся да спадобы Варняны. Чысценькія, акуратныя. А галоўнае, ёсць пусты будынак былой польскай гміны. Тут і рашылі часова размясціць райвыканком. Для райкома ж аблюбавалі двухпавярховы будынак, што ля касцёла. На першым паверсе была аптэка, яна так і засталася. На другім, дзе раней жыў аптэкар, абсталяваліся райкомаўскія кабінеты».

У жніўні 1940г. цэнтр раёна быў перанесены ў Астравец, дзе да гэтага часу былі пабудаваны неабходныя для раённых устаноў памяшканні.

Уладу на месцах у раёне сталі ажыццяўляць 15 сельсаветаў: Быстрыцкі, Байканскі, Міхалішкаўскі, Дзягенеўскі, Рымдзюнскі, Швяйлянскі, Варонскі, Варнянскі, Шульніцкі, Астравецкі, Гервяцкі, Вяліка-Якентанскі, Гудагайскі,Дравяніцкі, Валэйкішкаўскі.

Варнянскі сельсавет аб'ядноўваў 32 населеныя пункты, 889 двароў, дзе пражывала 3956 жыхароў, мелася 1 няпоўная сярэдняя і 1 пачатковая школа, чырвоны кутток, пошта,медпункт, 7 гандлёвых кропак, 1 прадпрыемства.

# У ПОЛЫМІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

У 1941 годзе мірнае жыццё было парушана раптоўным нападам на СССР. Нямецкі 39-ы танкавы корпус (камандзір – генерал танкавых войск Р.Шміт) наступаў на Вільнюс з поўдня і адкінуў савецкія войскі за р.Вілію. А гэта азначае — захоп Астравецкага раёна. Астравец размешчаны ўсяго за 42 км на ўс-ход ад Вільнюса. Адсюль і ўсе агульныя падзеі і нягоды. 24 чэрвеня вораг захапіў Міхалішкі і падступіў да Свіры. Яго 14-я матарызаваная дывізія (камандзір генерал-маёр Фюрст) павярнула ад Вільнюса на Гудагай, авалодала райцэнтрам, узяла кірунак на Смаргонь, Маладзечна. За ёй рухаліся калоны 20-й танкавай дывізіі — да Мінска.

**Памяць:** Гіст. – дакум. хроніка Астравецкага раёна. – Мн.: БелЭн,2004. -632с.

Вёска Варняны была занята акупантамі ў першыя дні вайны. Адразу ж быў устаноўлены “новы парадак”. Гаспадаром Варнян быў нямецкі капітан, якога забілі ў 1944 годзе польскімі партызанамі. Мясцовае насельніцтва павінна было здаваць пэўную колькасць зерня, якое ішло на ўтрыманне гітлераўскай арміі. Тых, хто здаваў яго несвоечасова, каралі.

У Варнянах быў размешчаны гарнізон латвійскіх стралкоў, створаны паліцэйскі ўчастак. Паліцаямі былі літоўскія

нацыяналісты, у школе знаходзілася нямецкая камендатура. Тут, каля школьнага будынку, былі растрэляны 2 мясцовыя жыхары. Адзін з іх жыхар вёскі Газа Гейба, другі жыхар вёскі Калонія Сыс. Да месца растрэлу былі сагнаны жыхары бліжэйшых вёсак.

Мясцовае насельніцтва дапамагала часцям Савецкай Арміі і партызанам. Пра гэта сведчаць наступныя факты. Жыхар вёскі Варняны Вялічка Адам хаваў некалькі чалавек ваеннапалонных. Жыхар вёскі Чыжоўшчызна Блашкевіч Іосіф хаваў двух савецкіх салдат, якім удалося ўцячы з палону. Над тэрыторыяй Варнян было збіта два савецкія самалёты. Лётчыкам, якія паспелі схавацца ад немцаў, таксама была аказана дапамога насельніцтвам.

Асноўная частка мясцовага насельніцтва была прызвана ў дзейнічаючую армію. Многія з іх прымалі актыўны ўдзел у вызваленні Польшчы, Венгрыі, Чэхаславакіі. Многія з іх загінулі смерцю храбрых.

***Да іх адносяцца:***

<u>в. Варняны</u>

1. Равойць Станіслаў — загінуў 2 сакавіка 1945г. пры вызваленні г.Будапешта
2. Кардзіс Аляксандр — загінуў пры ўзяцці Берліна ў 1945г.
3. Валуевіч Фрыдрых
4. Кірэйак Валер'ян
5. Александровіч Рыгор
6. Гражуль Мечыслаў
7. Бурбуль Фран Іосіфавіч
8. Масейка Мечыслаў Эдуардавіч
9. Рогач Часлаў Адольфавіч
10. Масейка Іван Іосіфавіч
11. Бублевіч Іосіф Ігнатавіч
12. Глазко Сцяфан Іванавіч

<u>В.Стаўбуры</u>

1. Штура Іосіф Браніслававіч — загінуў 10.02.1945г. на тэр. Германіі

<u>В. Больнікі</u>

1. Дрэма Іосіф Іванавіч
2. Дрэма Вітольд Іванавіч — загінуў 05.03.1945г.
3. Недалтоўскі Вікенцій Андрэевіч — загінуў без вестак у сакавіку 1945г.
4. Русенчык Фелікс Мацвеевіч — загінуў без вестак у сакавіку 1945г.
5. Лукша Мечыслаў Антонавіч
6. Тумко Баляслаў Іосіфавіч
7. Рогач Вікенцій Антонавіч

8 Кухарэвіч Баляслаў Андрэевіч

9. Лукша Іосіф Дамінікавіч

В. Бадзівалы

1. Боўша Вацлаў — загінуў у 1944г. у баях за г. Вільнюс
2. Бублевіч Ісіф — загінуў у 1945г. на тэрыторыі Польшчы
3. Бублевіч Станіслаў — загінуў без вестак у 1945г.

В. Чыжоўшчызна

1. Радута Адам Адамавіч — загінуў у 1945г. на тэр. Германіі
2. Боўша Станіслаў Мацвееіч
3. Русецкі Іван Феліксавіч
4. Шэміс Яцэк Іосіфавіч

Многія ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны вярнуліся ў сваю вёску. Гэта Адула Л.У., Пацэль Б.К., Аўгуль В., Кайрыс І.Б., Масейка В.А. і інш.

Вёска Варняны была ў акупацыі да 1944 года. Вызвалена трэцім гвардзейскім механізаваным корпусам пад камандаваннем гвардыі генерал-маёра Абухова сумесна з партызанамі.

5 ліпеня быў атрыманы загад аб наступленні ў напраўленні Солы — Вільнюс з задачай да світанку наступнага дня авалодаць раёнам Варняны, Шуск, Малі і далей, ва ўзаемадзеянні з пятай арміяй пачаць штурм г. Вільнюса. Армія генерал – лейтэнанта Крылова асноўнымі сіламі павінна была дзейнічаць злева ад корпуса, у параўленніі Валожын – Вільнюс.

У вёсцы знаходзіцца брацкая магіла, у якую перазахаваны воіны, загінуўнуўшыя ў час Айчыннай вайны на тэрыторыі Астравецкага раёна.
Імёны, захаваных у брацкай магіле воінаў (якія ўдалося ўстанавіць) падаюцца.



*Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан у в. Варняны*

## Братская могила советских воинов и партизан

**АЙМУХАНОВ Банар,** р. в 1914 в Карагандинской обл., Казахстан, рядовой, погиб, похоронен 6.7.1944.

**ВИСЛОВ Ннколай Радионович,** младший лейтенант.

**ЗАГАЕЦКНЙ Анатолий Иванович,** р. в 1920 в с. Бабино Ильинецкого р-на Винницкой обл., Украина, ефрейтор, погиб, похоронен 15.7.1944.

**ИНВАЛИЕВ Дмитрий Фёдорович,** р. в 1922 в с. Красномель Челябинской обл., младший сержант, погиб, похоронен 6.7.1944.

**КСЕНОФОНТОВ Алексей Фёдорович,** р. в 1915, старший сержант, погиб, похоронен в 1944.

**ЛОБАСТОВ Павел Александрович,** р. в 1917 в д. Киселёво Поназыревского р-на Костромской обл. рядовой, погиб, похоронен 26.3.1945.

**ЛЫСЕНКО Павел Иванович,** р. в г. Верхнее Лисичанского р-на Луганской обл., Украина, гв. сержант, погиб, похоронен 6.7.1944.

**ПОТАПОВ Пётр Фёдоровнч,** р. в д. Заровы Крупского р-на Минской обл., партизан, погиб, похоронен 24.7.1944.

**РОЖКОВ Яков Петрович,** р. в 1903 в д Рюкша Швининского р-на Томской обл., рядовой, погиб, похоронен 6.7.1944.

**СИТАЛЕВ Фёдор Нванович,** р. в 1910, рядовой, погиб, похоронен 13.9.1944.

**УХОВ Владимир Кондратьевич,** р. в 1925 в г. Астрахань, рядовой, погиб, похоронен 7.7.1944.

**ФЕДОРЧУК Семён Григорьевич,** р в 1900 в с. Коломая Ивано-Франковской обл., сержант, погиб, похоронен 7.7.1944.

**ФРАНЦУЗОВ Николай Кузьмич,** р. в д. Дурино Кировского р-на Калужской обл., рядовой, погиб, похоронен 8.7.1944.

**ЯГАН Павел Максимович,** р. в с. Гельмязово Золотоношского р-на Черкасской обл., Украина, ефрейтор, погиб, похоронен 6.7.1944.

## Лёс яўрэйскага насельніцтва в. Варняны Астравецкага раёна у час Вялікай Айчыннай вайны

Да прыходу фашыстаў у Варнянах пражывала прыкладна 50 яўрэяў. Трымалі свае крамы (больш за 10), карчму, пякарню,

рэстаран. Быў свой равін і сінагога. Былі сярод іх шавец, краўчыха, цырульнік..

Дзве сям'і на той час былі заможныя: мелі па 30га зямлі, трымалі па 10 кароў, наймалі парабкаў і добра ім плацілі. Размаўлялі яўрэі на польскай і рускай мовах, а паміж сабой — толькі па-яўрэйску. У суботу, святочны для яўрэяў дзень, нічога нельга было рабіць, таму наймалі для паўсядзённай працы мясцовых жыхароў і плацілі за гэту работу. Яўрэйскія дзеці бавілі час разам з мясцовымі, разам хадзілі ў польскую школу. Дамы ў іх былі мураваныя, пабеленыя, крытыя чырвонай чарапіцай. Частка іх захавалася да нашых дзён.

Немцы з'явіліся ў Варнянах на матацыклах і конях. Размясцілі ў вёсцы свой штаб (на тым месцы цяпер дзіцячы садок). Жылі ля ставоў у палатцы. Адразу сталі патрабаваць у мясцовага насельніцтва курэй, яйкі, малако, гародніну. Абавязалі жыхароў здаваць збожжа.

Усё насельніцтва прымусілі хадзіць на працу. Рабочы дзень пачынаўся ў 7 гадзін раніцы па сігналу (білі па жалезу) і працягваўся да заходу сонца.

На тым месцы, дзе цяпер знаходзіцца аптэка, фашысты паставілі слуп, ля яго расстралялі дваіх мірных жыхароў: Гейбу з Загазі і Сыса з Чэрнішак за сувязь з партызанамі. Да месца пакарання былі сагнаны ўсе жыхары Варнян.

Гаспадаром у Варнянах стаў капітан Квятко. Размаўляў па польску. Акрамя немцаў (іх было нямнога), у Варнянах размясціліся літоўцы і латышы, якія ваявалі на баку фашыстаў.

Усіх яўрэяў сагналі ў гета, якое размяшча лася на сучаснай вуліцы Савецкай. Яно было абнесена дашчатым плотам вышынёй 3 метры, зверху знаходзіўся калючы дрот. Яўрэя вадзілі на розныя работы. Тых, хто не мог добра працаваць па хваробе або старасці, білі гумовымі палкамі. Адзін з яўрэяў Гіцаль Фулюра паспрабаваў уцячы, але быў застрэлены. Больш яўрэяў у Варнянах не расстрэльвалі. Іх вывозілі ў бок Міхалішак, тлумачылі, што на работу, а на самай справе на расстрэл.

У 1944 г. Варняны вызвалілі партызаны. Пачаўся новы этап жыцця вёскі.

*Запісана са слоў Шыманскай Ядвігі Іосіфаўны, 1926 г.н.*

Асаблівасцю вызваленчых баёў на Астравеччыне можна назваць тое, што першымі населеныя пункты вызваляліся партызанскімі атрадамі,якія дзейнічалі як бы ў авангардзе наступаючых часцей 5-ай арміі 3-га Беларускага фронту. Праз Гервяты і Варняны на Вільнюс наступалі часці 8-ай гвардзейскай механізаванай брыгады, 1705-га зенітнага палка і 1-га асобага Маладзечанскага матацыклетнага батальёна. Праз Падольцы, Завельцы, Газу, Гродзі, Варняны, Катлоўку ў перыяд 6-7 ліпеня 1944 года прайшла 215-я дывізія Героя Савецкага Саюза генерал – маёра А.А.Казарана.

Раён быў вызвалены. На Астравеччыне пачалося адраджэнне савецкіх органаў улады — раённых арганізацый, камендатуры, сельскіх Саветаў. Пачалося аднаўленне разбураных прадпрыемстваў, дарог, мастоў, ліній сувязі.

## Яны прайшлі дарогамі вайны

## ДЕРЕВНЯ **ВОРНЯНЫ**

**Адула Людвіг Іванавіч,** н. у 1920г., в. Варняны;
**Андрыенка Мікалай Паўлавіч,** н. у 1925г., в. Варняны;
**Багдановіч Людвіг Уладзіслававіч,** н. ў 1925г., в.Варняны;
**Баговіч Пётр,** н. ў 1910г., в.Варняны;
**Валуевіч Мар’ян Адольфавіч,** н. ў 1923г., в.Варняны;
**Казакевіч Віктар Данілавіч,** н. ў 1924г., в.Варняны;
**Кайрыс Баляслаў Баляслававіч,** н. ў 1926г., в.Варняны;
**Касцееў Мікалай Міхайлавіч,** н. ў 1926г., в.Варняны;
**Лянкевіч Станіслаў Станіслававіч,** н. ў 1922г., в.Варняны;
**Паршонак Хрысціна Іосіфаўна,** н. ў 1915г., в.Варняны;
**Пекар Аляксей Іосіфавіч,** н. ў 1926г., в.Варняны;
**Петрык Віктар Уладзіслававіч**, в. Варняны;
**Петрык Станіслаў Міхайлавіч**, н. ў 1913г., в.Варняны;
**Русакоў Васілій Карпавіч,** в. Варняны;
**Рыпінскі Браніслаў Францавіч,** н. ў 1916., в.Варняны;
**Скубілаў Рыгор Кузьміч,** н. ў 19253., в.Варняны;
**Чахрач Станіслаў Антонавіч,** н. ў 1913г., в.Варняны;
**Юркойць Станіслаў Вікенцьевіч,** н. ў 1920г., в.Варняны.

# АДУКАЦЫЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

Адукацыя насельніцтва ў Варнянах мае даўнюю традыцыю. Ёсць дакумент ад 05.05.1593г., які сведчыць аб існаванні ў Варнянах школы пры каталіцкім парафіянальным касцёле, фундатарам якога з'яўляўся Ян Абрамовіч. Гэта — перaказны дакумент каралеўакага маршалка, мейшагольскага дзяржаўцы князя Яна Баляслававіча Свірскага, якім ён перадаў Яну Абрамовічу калятарскія правы на касцёл, фундаваны Яго продкамі ў пачатку 16ст.

Вядома, у 1864 годзе было заснавана Варнянскае народнае вучылішча, якое размяшчалася ў грамадскім доме. На ўтрыманне яго з казны адпускалася 200 руб. у год. Вучыўся там 21 хлопчык.

***Дакументы сведчаць.***

**Штраф за школы**

*Нядаўна ў Варнянах Віленскай губерні адбыўся суд над прафесарам Краўялісам за літоўскія школы. Краўяліс ёсць старшынёй Літоўскага прасветнага таварыства ў Віленшчыне «Рытас» (польская ўлада палічыла нязгоднымі з законам). Краўяліса, некаторых вучыцеляў і бацькоў асудзілі ў Варнянах на штраф па 100 мільёнаў кожнага. Словам, цяжка ў нас пашыраць родную асвету.*

***Газета «Крыніца», 1924.№ 4.***

***Памяць:*** *Гіст. – дакум. хроніка Астравецкага раёна. – Мн.: БелЭн,2004. -632с. с. 165.*

Народная асвета на Астравеччыне у час польсакй улады знаходзілася на нізкім узроўні. Да 1939 г. тут працавала усяго 36 пачатковых школ, у якіх навучалася 540 вучняў, 4 школы другой ступені, дзе займалася 270 вучняў. Фактычна народнай, на самой справе даступнай адукацыя стала толькі ў пасляваенны час, з прыходам Савецкай улады.

Вайна абяздоліла, асіраціла тысячы беларускіх хлапчукоў і дзяўчынак, многія з іх сталі безпрытульнымі. Загойваючы

нанесеныя вайной раны, дзяржава найперш турба-валася пра сірот, ратавалі іх ад голаду, холаду і хвароб.

Напачатку 1945 г. райвыканкомам было прынята рашэнне аб адкрыцці ў раёне дзіцячага дома на 300 дзяцей і перадачы ў распараджэнне райана маёнтка Дубнікі разам з дапаможнымі пабудовамі. Акрамя таго, ляснічаму Файгелю належала перадаць 100 кубаметраў сухога лесу райаддзелу народнай адукацыі; прамкамбінату — вырабіць 300 ложкаў, 25 вучэбных сталоў, 5 сталоў для сталовай, 3 — для кухні, 100 тумбачак, 20 шафаў. Дырэктарам дзіцячага дома быў прызначаны М.М.Муркоў.

Пазней дзіцячы дом быў пераведзены з Дубнікаў у Варняны. Рашэннем выканкома райсавета ад 5.3.1945 г. яму былі перададзены будынкі Варнянскага касцёла — двухпавярховы мураваны жылы дом, мураваныя і драўляныя аднапавярховыя дамы, гумно, амбар, хлеў, ксяндзоўскі фруктовы сад з 30 дрэвамі, участак зямлі ў 3 гектары, дом, дзе кватаравалі ўрачы, дом арганіста. Пазней Варнянскі дзіцячы дом быў ператвораны ў школу-інтэрнат, якая праіснавала да пачатку 1970-х гг.

У пасляваенныя часы праблема непісьменнасці і малапісьменнасці ў раёне стаяла востра, таму пачалі ствараცца школы па ліквідацыі непісьменнасці (лікбезы). Вячэрнія школы сялянскай і рабочай моладзі існавалі ў Астраўцы, Варнянах, Дайноўцы, Філіпанах, на станцыі Гудагай і ў інш. населеных пунктах.

У першыя пасляваенныя гады сельскія школы месціліся ў наёмных памяшканнях — звычайных сялянскіх хатах. Існавалі толькі 4 тыпавыя будынкі пачатковых школ, пабудаваныя да 1939 г. ў мястэчку Гудагай, Варнянах, Бабраўніках і Вароне. Гэта былі драўляныя дамы пад гонтавым дахам, выдзяляліся вялікімі і шырокімі вокнамі.

На працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя сталі сярэднімі сямігодкі ў Астраўцы (1946, першы дырэктар СШ — М.К.Алейнік), Варнянах (1949, дырэктар — А.Н.Харлык),

Гервятах (1953, дырэктар у той час — І.Н.Харловіч), Міхалішках (1954).

З кожным годам павялічваліся асішаванні на народную асвету: у 1961 г. на патрабаванні народнай асветы ў раёне было асігнавана 686,2 тыс. рублёў, у 1967 г. — больш за 1,2 млн. рублёў.

Сапраўдны пералом у школьнай справе наступіў у пачатку 1970-х гг. На саюзным узроўні былі прыняты праграмы развіцця адукацыі ўсіх узроўняў на перспектыву, дзе асаблівая ўвага была нададзена агульнаадукацыйнай школе і асабліва сельскай. У раёне, як і па ўсёй краіне, пачалося маштабнае будаўніцтва аб'ектаў адукацыі, як за кошт дзяржаўных капітальных укладанняў, так і гаспадарчым спосабам, з дапамогай базавых гаспадарак. Так у 1976 г. пабудавана Варнянская сярэдняя школа на 784 вучнеўскія месцы і 8-кватэрны жылы дом для настаўнікаў пры ёй.

**Варнянскі ВВК**

У сувязі з адсутнасцю у раёне свайго ПТВ і неабходнасці падрыхтоўкі сваіх кваліфікаваных кадраў для сельскай гаспадаркі і прамысловых прадпрыемстваў у 1974 г. быў створаны Варнянскі міжшкольны вучэбна-вытворчы камбінат. Сумесна з Астравецкім ВВК (1980г.) за гады існавання ў іх падрыхтавана вялікая колькасць кваліфікаваных шафёраў, механізатараў, работнікаў гандлю, швачак; зараз рыхтуюць таксама аператараў электронна-вылічальнай тэхнікі, майстроў цырульніцкай справы і іншых. Да 80% шафёраў і механізатараў раёна атрымалі прафесійную падрыхтоўку ў Варнянскім і Астравецкім ВВК.

Афіцыйна варнянскі вучэбна-вытворчы камбінат адкрыты 1 кастрычніка 1975 г. ў будынку былой Варнянскай школы-інтэрната. Спачатку ў камбінаце праходзілі падрых-тоўку 400 — 450 вучняў-старшакласнікаў з 5 школ раёна па 4 епецыяльнасцях: трактарыст-машыніст, швейная справа, таваразнаўства, кулінарыя. У 1979 г. да пералічаных дадаліся аўтасправа, лесавод, аператар машыннай дойкі. Працавала 7 педагогаў і майстроў. Першы дырэктар —

Зянон Вацлававіч Аўгуль. З 1981 г. камбінат узначальвалі Сяргей Віктаравіч Шэйн і Іосіф Эдуардавіч Доўнар. У 2003 г. кіраўніком прызначаны Віктар Часлававіч Чапукойць. З першых дзён у камбінаце працуюць намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Станіслаў Уладзіміравіч Вярбіцкі, майстар швейнай справы Яніна Баляславаўна Сянюць. Шмат гадоў адпрацавалі педагогі З.В. Аўгуль, А.П. Асадчук. У 1975 — 2004 гг. камбінат скончылі 4174 навучэнцы, болыпасць з іх працуюць у калгасах, розных галінах народнай гаспадаркі, узначальваюць сельскагаспадарчыя прадпрыемствы і кааператывы. У 2003/04 навучаным годзе ў Варнянскім вучэбна-вытворчым камбінаце 20 вучэбных груп, 351 навучэнец з 12 школ Астра-вецкага раёна вучацца па спецыяльнасцях: аўтасправа, трактарыст-машыніст, швейная справа, таваразнаўства. У камбінаце 8 класаў, 4 лабараторыі па абслугоўванні аўтатрактарнай тэхнікі, майстэрня, клас-магазін па таваразнаўстве, аўтатрактарадром. Працуюць 10 майстроў і педагогаў.

***Гісторыя Варнянскай школы***



*Будынак царскай школы (1774г.)*

Гісторыя адукацыі ў Варнянах — адна з найболыш цікавых у раёне. У другой палове 16 ст. староста лідскі, ваявода мінскі, потым смаленскі, пратэстант Ян Абрамовіч заснаваў тут рэфармацыйны збор, шпіталь і школу. У 1777 г. Варнянскай парафіяльнай школе займалася 9 вучняў: 5 чалавек з сем’яў з сем’яў шляхты і 4 чалавекі — з сем’яў сялян. Пазней існавала чатырохгадовая школа, якая размяшчалася ў звычайнай драўлянай хаце (на месцы сучаснага лясніцтва). 13 верасня 1937 г. ў Варнянах адкрыта сямігадовая школа, пабудаваная польскімі ўладамі. Яе

першым дырэктарам быў Антоні Матарэвіч, працавала 7 настаўнікаў. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у 1939 г. школу ўзначаліў Ляшковіч. У час нямецкай акупацыі заняткі былі спынены, тут размяшчалася казарма. Восенню 1945 г. школа аднавіла сваю работу. Дырэктарам быў прызначаны Мікіта Харловіч. У 1952 г. Варнянская сямігадовая школа стала сярэдняй агульнаадукацыйнай. У пасляваенны час школу ўзначальвалі М.Ф. Ляцігін, А.І. Яфімчык, У.А. Салавей, М.А. Кляцоўскі, М.Р. Паршонак, І.І. Матулойць, Ф.І. Вяржбіцкі, Л.М. Сямянка, Ч.К. Навіцкі, У.А. Булавіцкі, З.В. Айгуль. З 1985 г. педагагічны калектыў узначальвае Н.А. Субач. Сярод выпускнікоў школы доктар філасофскіх навук Т.І. Адула, кандыдат медыцынскіх навук А.П. Кезля, доктар філасофскіх навук І.С. Ціхановіч, беларускі паэт Р.С. Бялячыц. У 2004 г. ў школе 314 вучняў і 37 насгаўнікаў. Вядзецца навучанне на павышаным узроўні беларускай мовы, матэматыкі, біялогіі, замежнай мовы. Выкарыстоўваюцца інавацыйныя тэхналогіі: “Крок за крокам”, мадэль “Арыенцір”, “Майстар клас”, інфармацыйныя тэхналогіі, праектане навучанне. У школе працуюць

Гурткоў і клубаў, створаны гісторыка-краяўзнаўчы музей, адкрыты свой сайт у Internet.

**Памяць:** Гіст. – дакум. хроніка Астравецкага раёна. – Мн.: БелЭн,2004. -632с.

# АХОВА ЗДАРОЎЯ

Для аднаўлення сістэмы аховы здароўя ў вызваленым ад нямецкіх акупантаў раёне быў арганізаваны раённы аддзел аховы здароўя. Адным з першых мерапрыемстваў стаў дакладны ўлік усяго медперсаналу для далейшай арганізацыі медыцынскай сеткі ў раёне. Першым загадчыкам райаддзела быў У.К.Дарашкевіч.

У Астраўцы была адкрыта раённая амбулаторыя, вёўся прыём хворых. Загадчыкам амбулаторыі быў прызначаны ўрач Аляк-сандр Іванавіч Лукаваты, фельчарам і медыцынскай сястрой па сумяшчальніцтву — Любоў Майсееўна Розум. На пасаду раённага дзяржаўнага санітарнага інспектара і начальніка санэпідстанцыі заступіў Аляксандр Панцеляймонавіч Шувалаў. Памочнікам санурача і адначасова інспектарам санасветы стаў фельчар Пётр Давыдавіч Лапікаў.

Неўзабаве пачалі ствараца ўрачэбныя ўчасткі ў сельсаветах: Варнянскі (для абслугоўвання насельніцтва гэтага і суседніх Варонскага, Быстрыцкага, Валэйкішскага сельсаветаў), Гервяцкі (паслугамі карысталіся і жыхары Швяйлянскага і Рымдзюнскага сельсаветаў), Міхалішскі (сюды прыходзілі лячыцца жыхары Шульніцкага сельсавета). Урачэбны ўчастак быў адкрыты ў Вялікіх Якентанах і абслугоўваў, акрамя аднайменнага сельсавета, яшчэ і Дзягенеўскі. Загадчыкамі названых урачэбных участкаў сталі, адпаведна, Ганна Аляксандраўна Фекіч, Алёйза Браніслававіч Гайль, Пётр Іванавіч Ляшчэвіч, Хава Мордкаўна (Ева Майсееўна) Канстанціноўская.

Паступова лячэбныя ўстановы папаўняліся кадрамі. Адкрылася раённая амбулаторыя (у будынку на месцы цяперашняга офіса падатковай інспекцыі), пры ёй — зубны кабінет і зубапратэзная лабараторыя, у якіх сталі працаваць урач Ганна Іванаўна Міхейчык і зубны тэхнік Барыс Ліпавіч Клер. Урачом-педыятрам раёна была прызначана Марыя Станіславаўна Казлоўская. Новыя спецыяліс-ты з'явіліся і на ўрачэбных участках. Сяліліся яны, як правіла, на прыватных кватэрах у вяскоўцаў, толькі пры раённай бальніцы ў Каменцы быў інтэрнат для персаналу, дзе ў невялікіх пакойчыках жылі сямейныя і, па некалькі чалавек, бессямейныя медыцынскія работнікі.

У канцы 1944 г. і ў 1945 г. была вялікая цякучасць кадраў. Выклікана яна была маса вым выездам жыхароў заходнебеларускіх абласцей у Польшчу. На пастаяннае жыхарства і выехалі туды ўрач Г.А.Фекіч, муж і жонка

фельчар і акушэрка І.А. і Ю.Ф.Лявіцкія з Варнянскага ўрачэбнага ўчастка.

Для спынення распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў і паспяховага лячэння хворых пры Варнянскім і Міхалішкаўскім урачэбных участках адкрываліся інфекцыйныя ізалятары. Адным з небяспечных захворванняў быў тыф, ачагі якога былі выяўлены ў Ігнацове, Беразоўцы, Валэйкішках і Слабодцы. Загадчыцы Варнянскага ўрачэбнага ўчастка С.М.Аўцюховіч было прадпісана ўзяць пад нагляд жыхароў гэтай мясцовасці.

# ГІСТОРЫЯ КАЛГАСНАГА ЖЫЦЦЯ

Першыя калгасы ў раёне былі арганізаваны нават у даваенны час — у 1940 годзе батракі з панскіх маёнткаў зберагглі жывёлу, збрую, плугі, якія затым былі перададзены прадстаўнікам савецкай улады. Такім чынам ужо ў 1940-м сяляне в. Ізабеліна аб’ядналіся ў сельгасарцель імя Сталіна, якую ўзначаліў Радзішэўскі; у в. Гервяты арганізаваны калгас імя Молатава (С.І.Гурскі); у Варнянах — імя Варашылава (П.І.Валуевіч). У былым маёнтку Варняны, на аснове якога і была створана савецкая гаспадарка, налічвалася 300 га зямлі, у т.л. 102га ворыва, 5 га саду, 20 га сенакосу, пад азёрамі на тэрыторыі маёнтка знаходзілася 65га. Тут таксама былі розныя гаспадарчыя (кароўнік на 100 галоў жывёлы, свінарнік, стайня) і жылыя пабудовы, млын, млын, кузня, сталярня, маслазавод, разбураны бровар, тарктар,малатарня, іншы сельскагаспадарчы інвентар. У маёнтку засталася жывёла ( ут.л. 34 каровы, 8 авечак, 12 коней), запасы зерня (у тым ліку 16т рысу) Камісія ўпаўнаважаных ад Народнага камісарыята саўгасаў БССР па абследаванні былых памешчыцкіх маёнткаў прапаноўвала арганізаваць на базе маёнтка Варняны і рыбную гаспадарку.

Актыўна ўключыўся ў работу калгас імя Варашылава і ў 1944г. У 1949 – 51гг., у час масавай калектывізацыі раёна, варнянскі калгас імя Варашылава ўзначальваў Уладзімір

Антонавіч Шыманец, у яго ўваходзілі 60 гаспадарак, меўся 61 конь.

**Памяць:** Гіст. – дакум. хроніка Астравецкага раёна. – Мн.: БелЭн,2004. -632с.

Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ад белапалякаў у 1939г. на месцы маёнтка пана Камінскага быў створаны калгас імя Варашылава. Першым старшынёй калгаса быў Валуевіч Браніслаў Ісоіфавіч, былы батрак пана. У калгасе было 200га ворыўнай зямлі. Існаваў калгас да Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны вядома што старшынёй быў Шыманец Уладзімір Антонавіч. У 1952 годзе па рашэнню агульнага сходу калгаснікаў калгасаў "Знамя Победы", імя Андрэева, "Ясная Паляна", імя Варашылава ў адну ўзбуйненую сельскагаспадарчую арцель (калгас) імя Варашылава.

У 1960г. пасля скасавання Маладзечанскай вобласці калгас імя Чапаева ўвайшоў усклад Гродзенскай вобласці, а затым, з 1962 года 1964 год знаходзіўся ў адміністрацыйным падпарадкаванні Ашмянскага раёна, бо Астравецкі раён быў скасаваны. У 1965г. сельскагаспадарчая арцель імя Чапаева ўвайшла ў склад зноў створанага Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці.

З 1954 года старшынёй калгаса быў абраны Паршонак Мікалай Рыгоравіч. У калгасе мелася ўжо 500га ворыўнай зямлі, 2 аўтамабілі. У 1958 годзе калгас набыў 6 трактароў, 1 камбайн.

Першым вадзіцелем калгаса быў Валуевіч Мар'ян Адольфавіч. У калгасе развіваліся дзве галіны: жывёлагадоўля і раслінаводства. У 1958г. згодна рашэння Савета Міністраў БССР калгасу была перададзена рыбная гаспадарка.

У 60-80-ыя гг. калгасам кіраваў Пostраш Уладзімір Пятровіч. Калгас быў адным з лепешых у раёне, дзе атрымоўвалі высокія ўраджаі. Больш заможна сталі жыць і калгаснікі, шмат будавалася жылля.

Затым калгас прыняў Шагун Мар’ян Вацлававіч, які таксама шмат гадоў аддаваў далейшаму яго развіццю.

Рук Уладзіслаў Эдвардавіч — быў абраны апошнім старшынёй калгаса. У 2003 годзе гаспадарка была пераіменавана ў СВК “Варняны”. Па яго мерваванню, каб жыць і развівацца, неабходна пастаянна рухацца наперад. Ён лічыць, што Варнянам вельмі пашанцавала, бо ў яго былі граматныя папярэднікі, спецыялісты у сельскай гаспадарцы. Пагэтаму і сёння кааператыву лягчэй існаваць, нарошваць вытворчасць.

Сёння гэта адна з моцных гаспадарак раёна, дзе ўкараняюцца новыя прагрэсіўныя тэхналогіі. У свой час Уладзіслаў Эдвардавіч пайшоў на смелыя крокі, каб вывесці з заняпаду свінагадоўчы комплекс, які зараз ўваходзіць у тройку лідэраў Гродзенскай вобласці. Пасля рабочага візіту ў Чэхію старшыня пераабсталяваў і кароўнік для дойнага статка гаспадаркі па метаду безпрывязнага ўтрымання жывёлы, што таксама дало свой плён.

На сённяшні дзень плошча тэрыторыі калгаса складае 6716га, сельгасугоддзямі занята 6144га, у т.л. 4066 ворыва, 2078га лугоў і пашы. У грамадскай вытворчасці занята 505 чалавек. У гаспадарцы ўтрымліваецца 2235 галоў буйной рагатай жывёлы, у т.л. 800 кароў, больш 10 000 свінапагалоўя.

**З матэрыялаў гаспадаркі**

# ІНШЫЯ ГАЛІНЫ ДЗЕЙНАСЦІ

У 1944г. утворана Варнянскае аддзяленне паштовай сувязі, куды з Астраўца газеты і часопісы дастаўляліся на конях, а ўжо адтуль — па астатніх вёсках сельсавета. Ездавыя з уласнымі коньмі і падводамі працавалі па найму. Пазней, калі ўтварыліся калгасы, транспартам паштавікоў сталі забяспечваць яны.

Загадам начальніка канторы сувязі і Астравецкай цэнтральнай ашчадкассы № 6490 ствараюцца агенцтвы ашчадкасы ў Гудагайскім, Варнянскім, Міхалішкаўскім аддзяленнях сувязі.

***За газетным радком. Па старонках раённай газеты “Сталінская праўда” (1945-50)***

***Радио на участках***

*Ворняны (по телефону). 31 января на Ворнянский избирательный участок было проведено радио. Для крестьян местечка Ворняны это было новшество.2 февраля учителя и другие активисты собрались на квартире директора школы т.Харловича, слушали по радио обращение ЦК КП(б)Б ко всем избирателям.*

*5 студзеня 1947г.*

************************

У гэты ж перыяд да паслуг насельніцтва сталі адчыняцца дзяржаўныя магазіны. Было арганізавана раённае спажыўтаварыства, якое ўзначальваў Іван Яўсеевіч Задкоў (паводле іншых крыніц — Аляксеевіч). У яго склад уваходзіла 6 сельскіх спажыўтаварыстваў: Варнянскае, Гервяцкае, Міхалішкаўскае, Астравецкае, Гудагайскае, Валэйкішкаўскае. У 1945 годзе Варнянскае сельпо (старшыня Баградовіч) лічылася лепшым , да прыкладу, толькі за 15 дзён рэалізавала тавараў на 70тыс. руб.

************************

У 1973 г. рэарганізавана і перайменавана ў Катлоўскае Варнянскае лясніцтва. У 1984 г. ў сувязі з перадачай у склад дзяржлесфонду значнай часткі калгасных лясоў, а таксама шляхам раздраблення існуючых лясніцтваў Варнянскае лясніцтва аднаўлена. Пачала ствараца яго матэрыяльна-тэхнічная база, пабудаваны тыпавы будынак.

***За газетным радком. Па старонках раённай газеты “Сталінская праўда” (кастрычнік 1997г.)***

***Лепшы населены пункт***

*Па выніках раённага агляду-конкурсу населеных пунктаў за прысваенне звання «Населены пункт высокай культуры быту і добраўпарадкавання» пераможцай прызнана вёска Варняны, дзе апошнім часам вельмі многа робіцца па добраўпарадкаванню і паляпшэнню культуры быту. Вёсцы прысвоена гэтае ганаровае званне, Варнянскі сельвыканком узнагароджаны Ганаровай граматай райвыканкома, яму выдзелена 6 мільёнаў рублёў для заахвочвання тых, хто найбольш вызначыўся ў правядзенні агляду-конкурсу.*

*Варняны будуць прадстаўляць наш раён на абласным такім жа аглядзе-конкурсе.*

# ГІСТОРЫЯ КАСЦЁЛА СВ. ГЕОРГІЯ



Першае ўпамінанне ў дакументах касцёла св. Георгія (Юрыя) з’явілася ў віленскага кафедральнага сабора паводле прывілеі вялікага князя ВКЛ Ягайлы. У 1462 г. Марыяна Сангайла (па іншых звестках — Марына) фундавала ў Варнянах касцёл і плябанію, першапачаткова драўляныя. У пачатку 16 ст. Варняны належалі князям Свірскім. Акт на абсталяванне Варнянскага касцёла ад 15.8.1508 г. падпісаны Андрэем Свірскім, які належаў да самых адукаваных людзей свайго часу, нейкі час выкладаў філасофію і рыторыку ў Кракаўскім універсітэце. З 1581 г. Варняны перайшлі ва ўласнасць ваяводы смаленскага Яна Абрамовіча, пратэстанта паводле веравызнання, які заснаваў тут кальвінскі збор, шпіталь і школу (існавалі да 1654), у сярэдзіне 17 ст. уласным коштам надрукаваў шэраг палемічных рэфармацкіх кніг. Яго нашчадкі перайшлі ў каталіцтва. З 1688 г. Варняны лічыліся мястэчкам Віленскага павета і да 1860 г. з'яўляліея ўласнасцю роду Абрамовічаў. У 1767 г. тут заснаваны дамініканскі кляштар.

У 1760 г. Юры Абрамовіч пачаў будаўніцтва мураванага касцёла ў гонар свайго нябеснага патрона Георгнія (Юрыя) разам з жонкай Марцыянай (па іншых звестках — Марыяй) з роду Дорыя-Дзерналовічаў, якая пасля яго заўчасней смерці працягвала актыўную дзейнасць па завяршэнні будаўніцтва святыні і стварэнні ўнікальнага горадабудаўнічага ансамбля цэнтра мястэчка, які захаваўся часткова. Першапачатковы

выгляд гэтага ансамбля вядомы па шэрагу гравюр 1-й палавіны 19 ст. і малюнаках Напалеона Орды 1373-75 гг. Ядро планіровачнай структуры мястэчка займала вялікая прамавугольная плошча, выцягнутая па восі ўсход—захад. Паўночны і паўднёвы падоўжныя бакі плошчы былі забудаваны аднатыпнымі драўлянымі жылымі дамамі, накрытымі вальмавымі дахамі, з пячным ацяпленнем, драўляна-мураванай канструкцыі. Фасады дамоў, арыентаваныя да плошчы, былі змураваныя з цэглы і злучаныя арачнымі праездамі ў двары — усё гэта стварала суцэльны ўпарадкаваны фронт забудовы. З усходу зрокавую перспек-тыву плошчы замыкае галоўны фасад велічнага касцёла, які з'яўляецца кампазіцыйнай дамінантнай усяго ансамбля.

Вось сіметрыі плошчы падкрэслівала шырокая алея, што злучала храм з сядзібай уладальніцы мястэчка. Па баках касцёла, пад вуглом да галоўнага фасада, пастаўлены 2 сіметрычныя двухпавярховыя камяніны, дзе размяшчаліся плябанія і дом аптэкара. Прамавугольныя ў плане будынкі, накрытыя вальмавымі дахамі, з фасадамі, аздобленымі шырокімі лапаткамі, анфіладнай планіроўкай і крыжовымі скляпеннямі 1-га паверха, мелі стылявыя рысы архітэктуры позняга барока. Гэтыя будынкі злучала каваная агароджа з пілонамі і трохпралётнай брамай, упрыгожанай барочнай скульптурай. Агароджа хвалістай лініяй агінала тэрыторыю касцёла.

Георгіеўскі касцёл у Варнянах пабудаваны ў стылі віленскага барока ў 1760 — 69 гг. і кансекраваны біскупам віленскім Т.Зяньковічам. Асноўны мастацкі акцэнт, адпаведна яго дамінантнай ролі ў ансамблі, зроблены на галоўным двухвежавым фасадзе касцёла, які выступае за межы аеноўнага аб'ёма і вызначаецца вытанчанасцю і ажурнасцю сілуэта. Заглыбленая цэнтральная частка завершаная высокім двух'ярусным атынкаваным франтонам. Шмат'ярусныя чацверыковыя вежы маюць увагнутую паверхню прасценкаў паміж звязкамі вуглавых пілястраў, што стварае тонкую нюансіроўку падаючых і

слізгаючых ценяў. Імклівасць вертыкальных ліній супакойвае мяккі малюнак абрысаў франтона і праёмаў. Як і суседні Быстрыцкі Крыжаўзвіжанскі касцёл, Варнянскі Георгіеўскі касцёл мае адзін прамавугольны неф, падзелены сіс-тэмай спараных пілястраў і падпружных арак на 2 часткі, перакрытыя цыліндрычнымі скляпеннямі з распалубкамі. Двухчасткавая структура нефа, якая сустракаецца даволі рэдка, з'яўляецца адметнасцю Астравецкага рэгіёна.

Амаль роўная па даўжыні з нефам выцягнутая прахмавугольная апсіда прэсбітэрыя мае аналагічныя скляпенні, але больш інтэнсіўны рытм падпружных арак, якія падзяляюць апсіду на 3 часткі. Па баках прэсбітэрыя размешчаны нізкія сіметрычныя прамавугольныя аб'ёмы, падзеленыя на 2 часткі, у якіх размяшчаюцца капліцы і сакрысціі. Над уваходным памяшканнем, якое злучана з прасторай нефа арачнымі праёмамі, размешчаны арганныя хоры з пластычным хвалістым абрысам агароджы. Інтэр'ер упрыгожвалі пышныя алтары, амбон, лавы і канфесіяналы з ракайльным дэкорам. У галоўным алтары знаходзіліся абразы «Увазнясенне» і «Св. Ян Непамук» — абодва работы вучняў вядомага мастака С.Чаховіча, перанесеныя ў Варняны з касцёла св. Казіміра ў Вільні. Пад парогам святыні, пад жалезнай плітой пахавана фундатарка М.Абрамовіч. Каецёл быў рэканструяваны ў 1880 і 1909 гг., у 2-й палавіне 20 ст. доўгі час не дзейнічаў, адноўлены і рэкансекраваны ў 1990 г.

Процілеглы ад касёла заходні бок рынкавай плошчы замыкала масіўная каваная агароджа на высокім падмурку, якая аддзяляла мястэчка ад рэпрэзентатыўнага сядзібна-пар-кавага комплекса яго ўладальнікаў.

# СТАРАДАЎНІЯ СЯДЗІБЫ

Самай значнай і шырока вядомай у раёне была сядзіба ў Варнянах. У 15 ст. мясцовасць называлася Касакоўшчызна або Сільвестраўшчызна і належала Сангайлам. У 1462 г. Марыяна Сангайла заснавала тут касцёл і пабудавала дом прыходскага святара. У 16 ст. ўласнікі часта мяняліся. У 1503 г. Варнянамі валодалі князі Пятковічы. Адпаведна дакументу за 1507 г. князь Глеб Пронскі страціў варнянскі маёнтак. У 1511 г. пацвярджэнне на валоданне маёнткам атрымалі князі Пётр і Андрэй Свірскія, Рыгор Станіслававіч Осцік. У 1522 г. маёнтак належаў Марыне Войцехавай Чыжовай. У 1567 г. сярод уласнікаў Варнян былі Станіслаў і Павел Чыжы. У 1581 г. Варняны адышлі Абрамовічам і належалі гэ-таму роду амаль 3 стагоддзі — да 1867 г.

У актах за 1596 г., што тычацца г. Вільня, называецца «Ян Абрамовіч на Варнянах, военода Смоленскій, ... староста Лідскій і Венденьскій...». Ян выхоўваўся пры двары Мікалая Радзівіла Рыжага, удзельнічаў у многіх военных паходах, з'яўляўея вядомым дзеячам-кальвіністам, вылучаўся адукаванасцю, друкаваўся сам, выдаў за свой кошт кальвінісцкі «Катэхізіс» і іншыя кнігі. У Варнянах пабудаваў кальвінісцкі збор, шпіталь і школу, якія існавалі да сярэдзіны 17 ст. Традыцыі бацькі працягваў Мікалай (яму ў пачатку 17 ст. адышоў Варнянскі ключ), прыхільнік кальвінізму, ваявода мсціслаўскі і трокскі, генерал літоўскай артылерыі. Пазней Варняны належалі Самуэлю, сыну Мікалая. Пасля смерці бацькі ён перайшоў у каталіцтва і закрыў дзедаў кальвінісцкі збор.

Наступнымі ўладальнікамі Варнян былі сын Самуэля, таксама Самуэль, а потым яго сыны. З іх найбольш вядомы Юрый (Ежы), падваявода віленскі, падчашы віленскі, стараста старадубскі. Быў жанаты на Марцыяне з Дзерналовічаў, якая пакінула значны след у развіцці Варнян. У 1760 г. яна пачала будаўніцтва варнянскага касцёла, а на месцы старой сядзібы Абрамовічаў заснавала новую рэзідэнцыю. Яе сын Яўхім у 1785 г. набыў у Сангушкаў

Дабраўлянскі ключ, пасля смерці маці яму адышлі бацькоўскія Варняны, а старэйшаму брату Андрэю, ротмістру кавалерыі ВКЛ — Дабраўляны.

Пасля Яўхіма Варняны належалі яго сынам Мікалаю і Ігнацію. Апошні прадаў Дабраўляны, не меў сына і на ім абарвалася галіна роду.

Пасля Абрамовічаў Варнянамі валодаў Андрэй Снядэцкі, унук Андрэя Снядэцкага, вядомага хіміка, урача, філосафа і асветніка, а пасля яго дачка Марыя Антаніна. Апошнімі ўладальнікамі былі Мілашы, а з1914г. — Зыгмунт Хамінскі, які ў хуткім часе правёў парцэляцыю маёнтка.

У 2-й палавіне 18 — 1-й палавіне 19 ст. сядзіба ў Варнянах лічылася адной з найпрыгажэйшых на Віленшчыне. Яна з'яўлялаея часткай так званага «ўзорнага» Варнянскага палацава-гарадскога архітэктурнага ансамбля, закладзенага Марцыянай Абрамовіч у 2-й палавіне 18 ст. па праекту архітэктара А.Каса-коўскага ў стылі позняга барока. Ён уключаў касцёл св. Георгія, плябанію і дом аптэкара, палацава-паркавы ансамбль, гасцініцу, карчму і 16 тыповых аднапавярховых жылых дамоў (захавалася 6).

Усе элементы ансамбля аб'яднаны адзінай кампазіцыйнай ідэяй і атрымалі агульнае стылявое вырашэнне. Дамінантай ансабля з'яўляецца Георгіеўскі касцёл, які замыкае плошчу з усходняга боку. Дом аптэкара і плябанія ўтвараюць перад храмам курданер. На процілеглым заходнім баку вось замыкае палацава-паркавы ансамбль.

Уяўленне пра палац і ансамбль наогул даюць 4 унікальныя літаграфіі 1820-х г., якія знаходзяцца ў зборах Нацыянальнага музея ў Варшаве, малюнкі Н.Орды і іншых аўтараў. Палац быў драўляны, двухпавярховы, з двума кароткімі крыламі з ганкамі,якія вялі ў парк, на від суровы і без значнага дэкору. На працягу 19 ст. некалькі разоў падвяргаўся рэканструкцыі, таму яго выгляд на малюнку 1900 г. значна адрозніваецца ад выявы на літаграфіях.

Сціплы знешні выгляд палаца быў кампенсаваны стылёвым унутраным убраннем. У аздабленні сцен пакояў

Канстанцінам Отасельскім, мастаком з вялікім густам, выкарыстоўваліся самыя лепшыя фарбы, пазалота, лак, тканіна. Сцены пакояў былі абцягнуты тканінай, часткова пакрыты драўлянымі панэлямі, столь мела багатую ляпніну і насценны жыва-піс, вокны і дзверы былі лакіраваны ў белы і залаты колер. Мэбля пакояў адпавядала часу эпохі і была ў асноўным у стылі Людовіка XVI.



*Палац у в. Варняны. Паркавы фасад. Літаграфія 1820-х гг.*

Сіметрычна з двух бакоў палаца стаялі 2 сціплыя драўляныя афіцыны. Паміж імі і палацам быў вялікі газон з кругам у цэнтры, вокал раслі клёны, ліпы, ясені, елкі, адзінка-выя дрэвы лістоўніцы еўрапейскай, сасны веймутавай, якія часткова захаваліся і дапа-магаюць высветліць месца параднага двара. Ён аддзяляўся ад плошчы ў мястэчку, якая служыла рынкам, узорнай металічнай агаро-джай на бутавым фундаменце з уязной брамай. Брама бачна на адной з літаграфій. Месца яе добра прасочваецца. Яна складалася з двух прамавугольных пілонаў, якія мелі пе-шаходныя праходы, завершаныя вазамі. Ад касцёла да брамы вяла ліпавая алея, а ад брамы да палаца — шырокая (12 м) кляновая алея (захавалася 11 дрэў).

Пры Снядэцкіх палац звонку і ўнутры зведаў значную рэканструкцыю. Ён быў абшаляваны, у цэнтральнай частцы будынка былі надбудаваны люкарны з двухсхільнымі дахамі, новае абрамленне атрымалі вокны, бакавыя крылы, што адлюстравана на адной з фатаграфій каля 1900 г. Пакоі

абсталяюцца новай мэбляй, палац папаўняецца новымі творамі мастацтва і фамільнымі каштоўнасцямі.

За палацам размяшчаўся парк. Аснову кампазіцыі яго складаў вялікі вадаём з востравам, да якога вёў перакідны мосцік. Вадаём з'яўляецца часткай складанай воднаіі сістэмы з 26 вадаёмаў — адной з найбуйнейшых сярод сядзіб Беларусі (каля 65 га). Водная паверхня з архітэктурнымі акцэшамі (млыном, броварам, павільёнам-купальняй, альтанкай з калонамі, неагатычнай вежай на востраве, пабудаванай пазней з чырвонай цэглы ў выглядзе крапасных збудаванняў сярэднявечча), дамбы, мосцікі, каналы складалі своеасаблівасць парку, надзялялі яго рамантычнымі матывамі.





*Карчма (1939г.) і фрагмент забудовы 18 ст. ў Варнянах*





*Вежа і млын у Варнянах (сучасны выгляд)*

# КУЛЬТУРА ВАРНЯНСКАЙ ЗЯМЛІ.

**Гісторыя бібліятэкі**

У 1939г. у в. Варняны была адна прыгмінная бібліятэка. Яе загадчыцай была Карневіч Ядвіга Францаўна. Кніжны фонд складаў 597 экз. кніг на польскай, французскай мовах. У бібліятэцы быў агульны фармуляр, у якім было запісана 28 чытачоў. У асноўным чыталі прцаўнікі гміны, і была запісана Масейка Ганна Васільеўна з в. Варняны, якая працавала прыслугай на кухні.

У 1940г. з прыходам Савецкай улады была арганізавана прыклубная бібліятэка, загадчыкам быў Булкоў В. Кніжны фонд састаўляў 326 экз. і 68 чытачоў.

У 1945г. у раёне разгортвалася сетка ўстаноў культуры. Ужо летам таго года дзейнічала 14 хат-чытальняў і 2 Дамы сацкультуры — у Астраўцы і Варнянах. Хата – чытальня ў Варнянах (загадчыца Я.Валуевіч) працавала актыўна, налічваўся харавы, драматычны і фізкультырны гурткі, гурток чытальнікаў.

У кастрычніку 1946г. дакладна вядома, што загадчыцай бібліятэкі стала Міронава Марыя Станіславаўна, якая скончыла курсы бібліятэкараў у Мінску *(фотазд. унізу злева)*. Доўгі час загадчыцай бібліятэкі працавала Лукша Тарэса Андрэеўна (Янковіч), якая скончыла Магілёўскі тэхнікум. Яна ўсё працоўнае жыццё аддала прафесіі бібліятэкара *(унізу справа)* .





З 1977 па 1986гг. загадчыцай бібліятэкі працавала Кайрыс Яніна Рамуальдаўна (Русецкая). Закончыла завочна Мінскі інстытут культуры

У 1998 годзе кніжны фонд бібліятэкі налічваў 15437 экз., чытачоў — 1100, кнігавыдача — 20000. на 01.01.2004г. кніжны фонд бібліятэкі склаў 15881 экз., чытачоў 1301, кнігавыдача — 24000. У цяперашні час у бібліятэцы адкрыта чытальная зала і працуе 2 бібліятэкары, з 1994г. загадчыцай стала Багдановіч Алена іванаўна, бібліятэкарам ч/з — Граблеўская Людміла Уладзіміраўна.

**Варнянскі народны ансамбль народнай песні «Світанак»** Варнянскага сельскага Дома культуры. Створаны ў 1977 г. Званне народнага прысвоена ў 1993 г. Заснавальнікі — педагогі першай у рэспубліцы калгаснай дзіцячай музычнай школы Аляксандр Сцяпанавіч і Аліна Вікенцьеўна Лянцэвічы. Кіраўнік Наталля Валер’еўна Ламека. Удзельнікі калектыву — настаўнікі Варнянскай СШ, работнікі СВК «Варняны», лясніцтва, гандлю, мытні, вучні старэйшых класаў. У рэпертуары беларускія, рускія, украінскія, польскія народныя песні, песні самадзейных аўтараў, удзельнікаў калектыву Аляксандра Альховіка і Людмілы Кухарэвіч. Калектыў праводзіць вялікую работу па адраджэнні, зберажэнні і развіцці культурнай спадчыны, абрадаў, традыцый і звычаяў роднага краю, супрацоўнічае з краязнаўчым аматарскім аб’яднаннем «Варнянская хатка» Варнянскай СШ. Ансамбль адрадзіў мясцовыя абрады «Прыём у кавалеры», «Варнянскі кірмаш», «Варнянскае вяселле», падрыхтаваў гульнёва-забаўляльную праграму «Варнянскае ігрышча», тэатралізаваныя канцэртныя праграмы «Ля Варнянскага млына», «У Варнянскіх ваколіцах». Вядзе актыўную канцэртную дзейнасць.

# ФЛОРА І ФАУНА

Вёска Варняны знаходзіцца на поўначы Гродзенскай вобласці. Рэльеф фарміраваўся пад уплывам леднікоў. Клімат характэрызуецца параўнальна мяккай зімой з няўстойлівым снежным покрывам ў ўмераным летам.

Каля 60% тэрыторыі займаюць сасновыя бары. На долю саснова-бярозавых і альховых пародаў прыпадае 27% і толькі 5% займаюць шыракалістыя лясы. У лясах вялікая колькасць відаў жывёльнага свету. Тут жывуць барсукі, куніцы, лятучыя мышы, лісы, ваўкі, зайцы, ласі, дзікі. Разнастайны птушыны свет: глухар, рабчык, цецярук, галубы, дзятлы, совы, каля 20 відаў вераб’іных. Флора ўключае больш 2000 відаў, фауна пазваночных налічвае больш 400 відаў.

# МЯСЦОВЫ ФАЛЬКЛОР

(любімыя песні, прымаўкі, прыкметы, дзіцячы фальклор)

-Бяда за бядою, як рыбка за вадою.
- Доўг не раве, толькі спаць не дае.
- Казаў Бог, каб ты памог.
- Той мае, хто ў руках трымае.
- Адна галава — не бяда, а калі і бяда, то адна.
- Адной маткі не адны дзеткі.
- Бацька за парог, дзеткі за пірог.
- Гадуй дочкі, а сам хадзі без сарочкі.
- Дзетак гадаваць — век каратаць
- Дзетак гадаваць — век гараваць.
- Не паклаўшы, не шукай
- Не сып солі на рану.
- Не ткні носа ў чужое проса.